**Міхась Белямук**
(Кліўленд)

## Пячатка князя Усяслава Чарадзея

Ужо каторы раз, перагортваючы „Актовые печати древней Руси X-XV вв.” В. Л. Яніна[1], задаю сабе пытаньне, чаму на яе старонках няма пячаткі полацкага князя Усяслава Брачыславіча, які пракняжыў 56 год (1044-1101). Гісторыкі, пачынаючы з В. Н. Тацішчава, пісалі: „Его же мать родила от волхования; и когда родился, было язвено на главе его, волхви же призванные сказали матери его, дабы оное язвено навязала ему на главе, и всегда бы носил его до живота своего”[2]. Б. В. Сапуноў адзначыў, што „биография Всеслава — это биография одной из самых ярких личностей XI в., крупного политического деятеля, при котором Полоцкая земля достигла своего расцвета”[3]. Другі выдатны гісторык М. Н. Ціхаміраў пісаў: „Для летописца Всеслав представлялся почти легендарной личностью, овеянной ореолом таинственности”[4]. А гісторык Б. А. Рыбакоў выказаўся гэтак: „Блестящий Всеслав заслонил собою всех троих Ярославичей (Ізяслава, Сьвятаслава і Усевалада — М. Б.) и промелькнул на русском горизонте, как та звезда превелика”[5]. Гэтак пісалі гісторыкі XVIII-XX стст., а аўтар „Слова о полку Игореве” (XII ст.) даў такую ацэнку: „Всеслав князь людем судяше, князем грады рядяше, а сам в ночь влъком рыскаше; из Киева дорискаше до Куръ Тмутороканя; великому хръсови влъком путь пресыкаше. Тому в Полотске позвониша заутренюю рано у Святыя Софеи в колоколы, а он в Кыеве звон слыша. Аще и веща душа в друзе теле, но часто беды страдаше”[6]. Таму нядзіўна, што народ даў яму імя Чарадзея і склаў быліны пра Волха Усяславіча.

1 В. Л. Янин, *Актовые печати древней Руси X-XV вв.*, Москва 1970, т. 1, с. 36, 166-167, 249, 281.
2 В. Н. Татищев, *История российская*, Москва — Ленинград 1963, т. 11, с. 79.
3 Б. В. Сапунов, *Всеслав Полоцкий в „Слове о полку Игореве”*, „Труды отдела древнерусской литературы”, Москва — Ленинград 1961, т. XVII, с. 76.
4 М. Н. Тихомиров, *Крестьянские и городские восстания на Руси XI-XIII вв.*, Москва 1964, с. 63.
5 Б. А. Рыбаков, *„Слово о полку Игореве” и его время*, Москва 1985, с. 63.
6 *Слово о полку Игореве, Игора сына Святослава, внука Ольгова*, Москва 1959, с. 19.

Пакольки полацкі летапіс бясьследна загінуў, то хрысьціянскае імя князя Усяслава Брачыславіча, здавалася, канула ў вечнасьць. Іншыя летапісныя крыніцы, якія дайшлі да нас, не аднатавалі ягонае хрысьціянскае імя, бо для летапісцаў быў ён вядзьмар, меў сувязь з паганствам і валодаў чарадзейскаю сілай. На знойдзеных пячатках XI ст. фігуравала хрысьціянскае імя князя, а князі мелі народнае, славянскае імя. Дасьледчык пячаткаў Валянцін Янін адшукаў у пісьмовых крыніцах, што кіеўскі князь Ізяслаў Яраславіч меў хрысьціянскае імя Дзьмітры, таму ўсе пячаткі зь імем Дзьмітры прыпісаў гэтаму князю, не зважаючы на іхную рознасьць у кампазіцыі.

Паколькі Ізяслаў Яраславіч княжыў у Ноўгарадзе ў 1052-1054 гадах, дык меў ён пячатку з эмблемай Рурыкавічаў, мы яе ўмоўна аднесьлі да пячатак першага тыпу.



Пячаткі першага тыпу, с. 249, № 3

На правым баку княжацкая эмблема Рурыкавічаў, па перыметры надпіс: „Госпадзі памажы рабу свайму Дзьмітрыю”. На левым баку (паўторым словы В. Л. Яніна) — „изображение св. Димитрия Солунского в полный рост, с копьем в правой руке и со щитом в левой”. Вакол галавы воіна — німб, што сьведчыла-б, што ён кананізаваны Царквою. На дзьвюх калёнках надпіс „агіос Дімітр”. Сьвяты Дзьмітры Салунскі зьяўляўся патронам кіеўскага князя Ізяслава Яраславіча.

Другі тып пячаткаў пад нумарамі 6, 7, 8, 9[7] розьніцца ад першага тым, што на правым баку замест эмблемы Рурыкавічаў — шматпялёсткавая разетка. Такую эмблему маюць толькі 4 пячаткі Ізяслава Яраславіча. Абводак прыгожа аздоблены. На левым баку, як кажа В. Л. Янін, „поясное изображение св. Димитрия Солунского с копьем в правой руке и со щитом в левой”. Вакол галавы німб, па баках надпіс „агіос Дімітр”.



Пячаткі другога тыпу, с. 249, №№ 6, 7, 8, 9

[7] В. Л. Янин, *Актовые печати древней Руси...*, с. 249.

Пячаткі з нумарамі 4 і 5[8] розьняцца ад папярэдніх. Іх мы аднесьлі да трэцяга тыпу. На правым баку пячатка мае чатырохпялёсткавую разетку з грэцкім крыжам у цэнтры і прыгожа аздобленую абводку.



Пячаткі трэцяга тыпу, с. 249, №№ 4, 5



Пячаткі трэцяга тыпу, с. 281 №№ 4, 5

Асаблівай увагі заслугоўвае левы бок пячаткі. На ім, як піша В. Л. Янін, „изображение человеческой фигуры в полный рост, в короне, с копьем и щитом”. На абводцы па-грэцку напісана „Дмітрэос”, але без слова „агіос” (сьвяты). Вакол галавы няма німба, а гэта азначае, што Царква не кананізавала гэту асобу. В. Л. Янін, апісваючы пячаткі князя Сьвятаслава (Мікалая) Яраславіча, інфармуе: „Отсутствие нимба в сочетании с княжеской шапкой позволяет установить, что на печатях изображен сам князь, владелец буллы”. На пячатцы трэцяга тыпу князь на галаве мае не шапку, але візантыйскую карону-дыядэму. Апрануты ён у пышнае адзеньне: паверх доўгай тунікі надзеты багаты сакас. Падобную вопратку насілі імператары Візантыі. Няма сумненьня, што на пячатцы паказаны князь Дзьмітры, але які князь Дзьмітры і чыя гэта пячатка? На ранейшых пячатках Ізяслава Яраславіча бачылі сьвятога Дзьмітрыя Салунскага, патрона князя Ізяслава. Ведаем, што князь Ізяслав Яраславіч княжыў у Кіеве з 1054 па 1078 год, але меў ён два перапынкі — у 1067-1068 і 1073-1077 гадах. Ці належыць пячатка трэцяга тыпу, на якой адчуваецца адбітак візантыйскага ўплыву, Ізяславу Яраславічу? Прыпушчаем, што яна не належыць князю Ізяславу Яраславічу, бо ён больш сымпатызаваў Рыму, чым Візантыі. Ад каталіцкага Захаду спадзяваўся атрымаць дапамогу ў барацьбе з князем полацкім Усяславам Брачыславічам і з родным братам Сьвятаславам Яраславічам, князем Чарнігаўскім.

На нашую думку, не выключана і такая мажлівасьць, што два розныя князі, якія жылі ў адным часе, маглі мець адно і тое-ж хрысьціянскае імя. Мы ня ведаем забароны даваць князю імя, якое было ўжо дадзена іншаму князю. Так, князь полацкі Усяслаў Брачыславіч мог атрымаць падчас хрышчэньня імя Дзьмітры. Язычнікам Усяслаў Брачыславіч ня быў, бо сябраваў з манахам Антоніем, заснавальнікам Пячорскага манастыра. Добрыя адносіны ён меў з візантыйскім імператарскім домам, бо выдаў дочку замуж за Мануіла Комнена[9].

[8] Там-жа, с. 249, 281.

[9] П. В. Алексеев, *Полоцкая земля (очерк истории северной Белоруссии) в IX-XIII вв.*, Москва 1966, с. 227.

У Візантыі толькі імператары і імператрыцы мелі права на сваіх пячатках зьмяшчаць вобраз Хрыста і свой партрэт. Напрыклад, пячаткі з XI ст. імператрыцы Тэадоры (1054-1056), Канстантына X Дукі (1059-1066), Андроніка (1067), Нікіфара III (1078-1081), Аляксея I Комнена (1081-1118)[10].



Пячатка Канстантына X Дукі

Іншым асобам, у тым ліку і князям так званай Русі, забаранялася зьмяшчаць вобраз Хрыста на пячатках. Усяслаў Брачыславіч, ведаючы пра забарону, зьмясьціў на пячатцы грэцкі чатырохканцовы крыж у выглядзе разеткі і свой партрэт.

Пра перайманьне візантыйскіх узораў сьведчыць і Радзівілаўскі летапіс, дзе зьмешчаны малюнак: полацкі князь Усяслаў з сынамі пераплывае Днепр для перамоваў з Яраславічамі[11].



На галаве Усяслава Брачыславіча — туфа. Такі галаўны ўбор ужываўся ў Візантыі, яго мелі права насіць „сыновья и братья императора”[12]. Зьяўленьне туфы ў Полацку ў час княжаньня Усяслава Брачыславіча сьведчыла-б пра блізкія адносіны візантыйскага імператарскага дома з домам полацкага князя Усяслава Брачыславіча.

Гэтыя прыяцельскія адносіны прадаўжаліся і пасьля сьмерці полацкага князя Усяслава. Ягоная ўнучка ігуменьня Еўфрасінія, замаўляючы ў Лазара Богшы крыж, пасылала пасольствы ў Візантыю да імперата-

10 G. Schlumberger, *Sigillographic de l'Empire Byzantin*, Paris 1884, c. 421-423.

11 *Радзивилловская или Кенигсбергская летопись*. Фотомеханическое воспроизведение рукописи, „Общество любителей древней письменности и искусства”, Санкт-Петербург 1902, с. 97.

12 Г. К. Вагнер, *Скульптура Владимиро-Суздальской Руси*, Москва 1964, с. 40.

ра Мануіла Комнена і патрыярха Лукі Хрысаверха, просячы пра частачкі гробу Прасьвятой Багародзіцы, сьвятога Крыжа Господняга, крыві Хрыста Збавіцеля нашага, мошчы сьвятых угоднікаў Божых. Ігуменьня Еўфасінія прасіла пра кропельку крыві сьвятога Дзьмітрыя Салунскага, бо ведала, што дзед пры хрышчэньні атрымаў імя Дзьмітры. Ушаноўваючы памяць дзеда, гэтую кропельку крыві сьвятога Дзьмітрыя Салунскага, патрона дзеда Усяслава, зьмясьціла на дзяржальні свайго крыжа.

Такім чынам, падагульняючы нашыя разважаньні, лічым, што ўласьнікам пячатак трэцяга тыпу зьяўляецца менавіта полацкі князь Усяслаў Брачыславіч Чарадзей, які меў хрысьціянскае імя Дзьмітры.